# Дзейнасць Саюза Бязбожнікаў на Гомельшчыне у 1920-я гг.

**Казлова Настасся Іванаўна,**
Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны ( г. Гомель, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны адной з важнейшых праблем у станаўленні антырэлігійнай палітыкі савецкай дзяржавы ў 1920-х гг.: арганізацыі і дзейнасці Саюза Бязбожнікаў. Грунтуецца на архіўных матэрыялах Гомельшчыны.*

У савецкай дзяржаве антырэлігійная прапаганда з'яўлялася адной з галоўнейшых форм барацьбы за сацыялістычнае пераўтварэнне грамадства. Асноўная яе мэта заключалася ў выкрыцці класавай сутнасці рэлігіі, распаўсюджванні атэістычнага светапогляду. Так, з сярэдзіны 1920-х гг. заўважную ролю ў грамадскім жыцці стаў адыгрываць Саюз Бязбожнікаў, які ствараўся як шырокая антырэлігійная арганізацыя, аснову якой складалі мясцовыя антырэлігійныя секцыі і гурткі.

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца разгляд дзейнасці Саюза Бязбожнікаў ў 1920-х гг. на тэрыторыі Гомельшчыны. Пры даследаванні дадзенай праблематыкі былі выкарыстаны архіўныя матэрыялы з Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Гомельская вобласці і з Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці [3–9].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Працэс фарміравання "бязбожнай" арганізацыі быў распачаты яшчэ ў пачатку 1920-х гг., калі з'явілася сетка антырэлігійных гурткоў па ўсёй Савецкай дзяржаве. З канца 1922 г. – пачатку 1923 г. з'яўляюцца цэнтральныя друкаваныя антырэлігійныя органы "Бязбожнік" і "Бязбожнік у станка". Вакол часопіса "Бязбожнік у станка" згрупаваліся галоўным чынам маскоўскія гурткі бязбожнікаў, а вакол газеты "Бязбожнік" – правінцыяльныя, якія аб'ядналіся ў "Таварыства сяброў газеты «Бязбожнік»"(ТСГБ) [1, с. 164]. Падобнага роду таварыства дзейнічалі і на тэрыторыі Гомельшчыны. Так, з 1924 г. ёсць дадзеныя аб дзейнасці таварыства "Бязбожнік" 2 Гомельскай чыгуначнай школы II ступені імя Калініна. У дадзенай арганізацыі быў свой статут, у якім былі вызначаны мэты і задачы таварыства: "аб'яднаць пад знаменамі атэізму ўсіх праціўнікаў рэлігіі для арганізацыі актыўнай барацьбы за духоўнае распрыгоньванне працоўных; садзейнічаць укараненню новага побыту на аснове новай сацыялістычнай абраднасці; распаўсюджванне антырэлігійнай літаратуры" [3, арк. 55]. Аднак, ужо с 1925 г. пачынаецца працэс афіцыйнага афармлення Саюза Бязбожнікаў. Гэта адбылося на I з'ездзе ТСГБ, які праходзіў у Маскве 19–26 красавіка 1925 г. З'ездам быў прыняты статут таварыства, абраны цэнтральны савет, што складаўся з 40 чалавек. Пленум ЦС ТСГБ абраў выканаўчае бюро ў саставе 10 чалавек ва главе з Ем. Яраслаўскім. 5 чэрвеня 1925 г. прэзідыум выканаўчага бюро ЦС ТСГБ прыняў рашэнне аб перайменаванні таварыства ў "Саюз Бязбожнікаў СССР" [1, с. 165]. Па тэрытарыяльнай прыкмеце структурная арганізацыя была наступнай: галоўным органам быў Цэнтральны савет Саюза Бязбожнікаў, ніжэй Губернскі (абласны) савет, якому быў падначалены Павятовы (акружны) савет Саюза, а самай малой структурнай адзінкай з'яўлялася мясцовая ячэйка. Ячэйкі СБ ствараліся ў гарадах на прадпрыемствах, пры навучальных установах, а таксама ў вёсках пры калгасах, пры хатах-чытальнях. Яны валодалі правамі юрыдычнай асобы, мелі статут, штамп і пячатку [2, с. 90].

Членам Саюза Бязбожнікаў мог быць кожны грамадзянін СССР, які валодаў выбарнымі правамі, не прытрымліваўся ніякага рэлігійнага культу [2, с. 90]. Пры ўступленні ў Саюз неабходна было заплаціць уступныя. Так, уступны ўзнос усталёўваўся ў вёсцы ад 2 кап., а членскія ўзносы ад 1-й кап. да 5-ці кап.; у горадзе ўступны ўзнос складаў 4 капейкі, а членскія ўзносы 5 кап. Што да матэрыяльнай базы ячэек, то асноўным сродкам атрымання грошай з'яўляліся працэнтныя адлічэнні ад членкіх узносаў. Так, 50% ячэйка пакідала для асабістых патрэб, а 50% адсылала ў вышэйстаячыя структуры СБ [4, арк. 1].

Для ўсіх ячэек былі распрацаваны і разасланы на месцы прыкладныя планы работы. Так, напрыклад, згодна з планам Мазырскага СБ асноўным зместам працы з'яўлялася: арганізацыя і афармленне ячэек у горадзе пры клубах і ў вёсцы пры хаце-чытальні; распрацаваць праграмы антырэлігійнай працы ў клубах, хатах-чытальнях; паставіць пытанне перад Белдзяржкіно аб забеспячэнні рабочых клубаў антырэлігійнымі фільмамі; дабіцца выпіскі школамі антырэлігійнай літаратуры і т. п. [5, арк. 4].

Трэба адзначыць, што праводзіліся Акруговыя з'езды "Бязбожнікаў", на якія запрашаліся члены раённых саветаў СБ, прадстаўнікі бязбожнай арганізацыі з вёскі. Дэлегаваліся яны пасродкам выбараў праз мясцовыя ячэйкі. На такія з'езды запрашаліся прадстаўнікі цэнтральных саветаў Саюза Бязбожнікаў БССР і СССР [6, арк. 1–3]. Праводзіліся і раённыя канферэнцыі "Бязбожнікаў" на якіх падводзіліся вынікі антырэлігійнай працы за акрэслены перыяд, прымаўся план антырэлігійнай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

працы на наступны, праводзіліся выбары ў раённы Савет Саюза, распрацоўваўся план арганізацыі новых ячэек СБ. Справаздачу аб праведзенай канферэнцыі неабходна было даслаць у Акрсавет СБ [7, арк. 5].

Асноўнай формай антырэлігійнай працы Саюза Бязбожнікаў на месцах з'яўлялася арганізацыя прыродазнаўча-навуковых гурткоў, правядзенне мастацкіх вечароў, ілюстраваных дакладаў, тэатральных пастановак, правядзення лекцый па антырэлігійных пытаннях. У вёсках, пры хатах-чытальнях праводзілася гучная чытка газеты "Бязбожнік", стваралі куток "Бязбожніка". Шырокая антырэлігійная праца праводзілася і пад час рэлігійных святаў [8, арк. 74–78].

Для падрыхтоўкі антырэлігійных кадраў ствараліся спецыяльныя гурткі пры ячэйках Бязбожнікаў [9, арк. 4] Так сама падрыхтоўка антырэлігійных кадраў праводзілася і пасродкам так званага завочнага семінарыя. Так, па ячэйкам СБ дасылаецца праграма і спіс літаратуры для семінарыя па падрыхтоўцы прапагандыстаў-антырэлігіознікаў разлічаная на 20 тыдняў. Па кожнай тэме праводзілася кантрольная пісьмовая работа, якую ўдзельнікі завочнага семінарыя надсылалі ў Акрсавет [6, арк. 2].

Трэба адзначыць, што сетка бязбожных арганізацый разрасталася. Так, з кружка "Таварыства сяброў газеты «Бязбожнік»" вырасла масавая арганізацыя на чале з Ем. Яраслаўскім, якая разгарнула сваю дзейнасць па ўсей краіне. Аднак, недастатковасць і дрэнная падрыхтоўка антырэлігійных кадраў, недахоп антырэлігійнай літаратуры, наглядных сродкаў агітацыі не вырашылі задач, якія ставіла перад сабой антырэлігійная арганізацыя Саюз Бязбожнікаў. Насельніцтва так і не стала масава бязбожным. Ужо на На II з'ездзе Саюзу Бязбожнікаў СССР, які праходзіў у Маскве 11–15 чэрвеня 1929 г., прыйшлі да адзінай думкі аб перайменаванні арганізацыі ў Саюз Ваяўнічых бязбожнікаў, падкрэсліўшы тым самым неабходнасць баявога, наступальнага ідэйнага змагання з рэлігіяй.

**Літаратура**


1. *Стрелец, Н.Ю.* Возникновение и деятельность Союза воинствующих безбожников / Н.Ю. Стрелец // ВЕСТНИК ОГУ. – 2012. – № 7(143). – С. 164–170.
2. *Черкасов, А.А.* Устав Союза Безбожников СССР / А.А. Черкасов // РУССКИЙ АРХИВ. – 2013. – № 2. – С. 89–92.
3. Устав общества Безбожников 2-й Гомельской железнодорожной школы II ступени им. Калинина // Государственный архив Гомельской области (ГАГО). – Ф. 9. Оп. 1. Д. 155. Л. 55.
4. Переписка по антирелигиозной пропаганде // Государственный архив общественных объединений Гомельской области (ГАООГО). – Ф. 253. Оп. 3а. Д. 21. Л. 1.
5. Плян работы Мазырскага Савета Саюза Бязбожнікаў на сакавік–май 1928 г. // ГАГООГО. – Ф. 253. Оп.3а. Д .21. Л. 4.
6. Протокол заседания Президиума Окрсовета "Безбожников" от 14. 03. 1929 г. // (ГАООГО). – Ф. 253. Оп. 3а. Д. 20. Л. 1–3.
7. Письмо для райсоветов Союза Безбожников // ГАООГО. – Ф. 253. Оп. 3а. Д. 20. Л. 5.
8. Протакол Совещания по вопросам антирелигиозной пропаганды при АПО Губкома от 23 января 1926 г. // ГАООГО. – Ф. 2. Оп. 1. Д. 818. С. 74–78.
9. Для райсовета общества Безбожников по антирелигиозной работе // ГАГООГО. – Ф. 253. Оп.3а. Д. 21. Л. 4.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова